**Мароз, М.** Курсам на Кабул / М. Мароз // Герой працы (Шуміліна). — 1988. — 23 лют. — С. 3.

## КУРСАМ НА КАБУЛ

Спытаў у Юрыя: ці помніць ён, якім днём праводзілі яго на вайсковую службу, і раптам падумалася: ці не пакрыўдзіцца – гэты ж дзень, як і дзень нараджэння, помніцца на ўсё жыццё.

– Забралі спехам, – прыгадвае Юрый Іваноў, – недзе за 4 дні. 28 верасня ўручылі павестку, а назаўтра раніцой – у ваенкамат. Вось так...

Праўда, дома гэтай позвы чакалі даўно, не заспела яна знянацку Юрыных бацькоў. Але ўсё адно ўсю ноч перад той апошняй раніцай у хаце не спалі. Не звялі вачэй: хацелася нагледзіцца, доўгія два гады не ўбачаць жа. А хлопец вырас статны, рабацяшчы. І салдат, напэўна, будзе неблагі – падумалі так у сям'і і суцешылі сябе: будуць жыць пісьмамі сына. Гэтымі нябачнымі ніцямі і і злучыць іх жыццё на дзве зімы і два лета.

Усе дзеці ў сям’і Аляксея Пятровіча і Валянціны Лявонаўны нарадзіліся ў вёсцы Мазуры недалёка ад Валатовак Мішневіцкага сельсавета. Чацвёра сыноў, як чатыры драбінкі шчасця для бацькоў. І кожны знайшоў сваю жыццёвую сцяжынку. Першыя трое ўжо маюць свае сем'і. Юрка – апошні, таму, мусіць, з такім жалем і тугой праводзілі яго на службу. Праводзілі з вёскі Каравайніца, дзе бацькі купілі дом. Падумалі так: Мазуры – вёска невялічкая, нахадзіўся Юрка ў Мішневічы ў школу – за няблізкую дарогу чатыры гады хадзіў. Вырашылі ў сям’і: хопіць. І вось малалецтва і ўсе юнацкія гады прайшлі яго ў гэтай вёсцы, недалёка ад Шуміліна. Некалі чужаніца, як нярэдка бывае, стала для яго другой радзімай.

І цяпер ужо Юрый не ўяўляе сябе без гэтай вёскі. Хаця і старая не забываецца, як толькі хто ўспомніць пра Мазуры – сэрца так і заб’ецца.

Канчаў юнак Шумілінскую сярэднюю школу № 1. Тут, апрача атэстата, атрымаў і правы шафёра. Пайшоў слясарыць на станцыю тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў. Адсюль і прызвалі на службу. У верасні 83-га. А ў снежні таго ж года пасадзілі на самалёт – з курсам на Кабул.

– Ці была хоць кропелька страху? – перапытвае Юрый і смяецца: – А пра гэта нешта і не думаў. Усё пра дом, пра сваіх сяброў, каго пакінуў на «гражданцы...».

Юрый ведаў пра душманаў, пра жахі, якія наводзілі яны на мірных жыхароў. Але ведаць – адно, Юрый не панюхаў, як кажуць, пораху вайны. Не адчуў сапраўднага халадку блізкай смерці. Адчуе, але гэта будзе пазней...

Не ведалі дома, у далёкай беларускай вёсачцы, што Юрыя перакінулі ў месцы, дзе на кожным кроку падсцерагала бяда.

Пісаў дамоў часта, пісаў, калі быў у каранціне. Пісаў, што ў Казахстане, а пра тое, што неўзабаве ў Афганістан – ні слова. Не хацеў, каб маці балюча было, навошта, каб яна начамі не зводзіла вачэй...

А дома ўсё адно здагадаліся. І па стылю апошняга «казахстанскага» пісьма, калі пісаў, што пераязджаюць у новае месца. І па нумару вайсковай часці. Уведалі ад некага, быццам падобнае «вэчэ» – там, у гарах Афганістана.

І пацяклі тады, пацягнуліся для Івановых у Каравайніцы доўгія і нудныя дні чакання...

А Юрый трапіў у рамонтны ўзвод, служыў вадзіцелем-слесарам. Сам за рулём, сам пад машынай. «Нянек» там не было – не тое што парой на «гражданцы». На кароткі час – у Кабуле, асноўная ж служба – у Джалалабадзе, дзе летам даходзіла да 60 цяпла. Помніць Юрый, як узводзілі сабе жытло – нешта накшталт казармы. З каменя, прывезенага з гор. Самі клалі гэтыя камяні, самі замазвалі глінай. Усім рамузводам. А пасля многія рабяты хварэлі: там, на чужой зямлі, «прыліпалі» хваробы, якія ў нас – гісторыя. Ён, праўда, не хварэў.

А той дзень, калі прабег халадок смерці, Юрый памятае доўга. Стаяў ён з сябрамі ля сваёй машыны, пра нешта гаварылі.

Вядомая справа: ідэальная цішыня гор неяк заспакойвае, прытупляе пільнасць. Так стаялі яны, і раптам абрынуліся горы агнём – застракаталі аўтаматы, кулямёты. Яны інстынктыўна прыгнулі галовы, і кулі прашылі ветравое шкло машын...

Увогуле ж іх дывізіён прыкрываў дарогу, не даваў разгуляцца на ёй душманам.

Два гады праслужыў Юрый Іваноў у абмежаваным кантынгенце савецкіх войск у Афганістане. Не ўсе, вядома, маглі паказаць сябе, нямала было ў салдата будзённага. Служыў, дзе было загадана, і не лічыў (і цяпер не лічыць), што яму не пашанцавала, што ён не мае ўрадавых узнагарод. Ён горды тым, што як трэба выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак. Як і тысячы звычайных савецкіх юнакоў-воінаў.

Працуе Юрый у раённым вузле сувязі, ён часты госць у школах. Пра што расказвае вучням, на што нацэльвае? Пра цяжкасці гаворыць, пра тую «чарнавую» работу, якой ні ў якім разе не павінен цурацца сапраўдны салдат. Бывала, прыгадвае ён, рамантуеш машыну, бярэш з зямлі ключы, а яны што з печы – пальцы апякаюць. Так спякотна было. А не станеш скардзіцца на тое, што цяжка, што баліць – ты салдат...

Пра гэта Юрый і расказвае рабятам, тым, хто заменіць яго на нялёгкім салдацкім пасту.

**М. Мароз**